Голас Радзімы

№ 37 (1711)
17 верасня 1981 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.



Лізавета КУДЛАСЕВІЧ, Надзея КАРПОВІЧ, Галіна БУТ-ГУСАІМ — удзельніцы самадзейнага хору «Крыніца». Асобныя песні з рэпертуару калектыву яны выконваюць трыо. (Фотарэпартаж пра «Крыніцу» са Століна змешчаны на 7-й стар.)

АДЗІН ДЗЕНЬ З ЖЫЦЦЯ СТАРШЫНІ КАЛГАСА ІВАНА ЖОГЛЫ
(«Пакінуць след»)
стар. 2—3

ВЕРУЮЧЫЯ ПАПЯРЭДЖВАЮЦЬ: «ЗАСЦЕРАГАЙЦЕСЯ ЗРАБІЦЬ РАКАВЫ КРОК...»
(«Нейтронное оружие — угроза миру»)
стар. 4

РЭЖЫСЁР ФІЛЬМА — БЫЛАЯ ЛЁТЧЫЦА-ФРАНТАВІЧКА
(«Змаганне пасля перамогі»)
стар. 7

падзеі · людзі · факты

СУСТРЭЧЫ Ў КРАМЛІ

У Савецкім Саюзе з дружалюбным візітам пабываў Генеральны сакратар ЦК КПВ Ле Зуан. 7 верасня ў Крамлі ён сустракаўся з Генеральным сакратаром ЦК КПСС, Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжневым. У час гутаркі Л. І. Брэжнеў і Ле Зуан з задавальненнем адзначылі, што савецка-в'етнамскія адносіны развіваюцца дынамічна як у колькасных, так і ў якасных адносінах. Памножыліся сувязі па партыйнай і дзяржаўнай лініях. Вырас аб'ём эканамічнага супрацоўніцтва. Л. І. Брэжнеў і Ле Зуан выказалі ўпэўненасць у тым, што паслядоўная палітыка сацыялістычных дзяржаў, накіраваная на аздараўленне сусветнага палітычнага клімату, сустрэне пазітыўны водгук адказных палітычных колаў розных дзяржаў, будзе энергічна падтрымана міжнароднай грамадскасцю.

Ад імя Цэнтральнага Камітэта КПСС у Вялікім Крамлёўскім палацы быў дадзен абед у гонар Генеральнага сакратара ЦК Камуністычнай партыі В'етнама Ле Зуана. Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнеў выступіў на абедзе з прамовай. У прыватнасці, ён сказаў, што агульнае крэда Савецкага Саюза і краін сацыялістычнай садружнасці ў знешняй палітыцы — гэта мір, мір для ўсіх, мір надзейны, справядлівы і непарушны.

Каб прыйсці да такога міру, патрэбны не столькі добрыя словы, колькі рэальныя справы, гатоўнасць на практыцы лічыцца з правамі і інтарэсамі іншых дзяржаў.

Што датычыць Савецкага Саюза, то мы ніколі не шукалі і не шукаем ваеннай перавагі. Далей за клопаты аб надзейным захаванні бяспекі сваёй краіны і бяспекі сваіх саюзнікаў мы не ідзём і ісці не маем намеру. Савецкі Саюз пастаянна заклікае адмовіцца ад стварэння новых, яшчэ больш грозных відаў зброі. Але скажу з усёй адказнасцю, — падкрэсліў кіраўнік Савецкай дзяржавы: мы не будзем абыякавымі да паяўлення падобнай зброі ў арсеналах ЗША і іншых удзельнікаў НАТО. Калі гэта адбудзецца, то савецкія Узброеныя Сілы будуць мець адпаведную процівагу такой зброі.

XXVI з'езд нашай партыі распрацаваў шырокую Праграму міру для 80-х гадоў. Савецкія прапановы былі адрасаваны ўсім краінам, яны заклікаюць служыць аздараўленню абстаноўкі ва ўсіх раёнах зямнога шара.

* * *

9 верасня ў Крамлі адбылася сяброўская сустрэча Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева з Генеральным сакратаром ЦК Народна-рэвалюцыйнай партыі Кампучыі, Старшынёй Савета Міністраў Народнай Рэспублікі Кампучыі Пен Саванам, які знаходзіцца на адпачынку ў Савецкім Саюзе.

У ходзе гутаркі Л. І. Брэжнеў расказаў аб рабоце КПСС і савецкага народа па выкананню намечанай XXVI з'ездам праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця, аб знешнепалітычнай дзейнасці КПСС і Савецкай дзяржавы, накіраванай на ўмацаванне міру і міжнароднай бяспекі.

НА ЗДЫМКУ: у час сустрэчы Л. І. Брэжнева з Ле Зуанам.

НОВЫЯ ГАРЫЗОНТЫ ДРУЖБЫ

У Мінску адбылася IV рэспубліканская канферэнцыя Беларускага аддзялення Таварыства савецка-в'етнамскай дружбы (ТСВД). Яе ўдзельнікі абмеркавалі вынікі работы за 1976—1981 гады і задачы актывістаў аддзялення па расшырэнню і паглыбленню дружбы і культурных сувязей паміж савецкім і в'етнамскім народамі.

Са справаздачным дакладам выступіў намеснік старшыні праўлення Беларускага аддзялення ТСВД, сакратар Белсаўпрофа С. Аржаўкін. На канферэнцыі было адзначана, што адносіны дружбы і супрацоўніцтва савецкага народа і працоўных СРВ — першай дзяржавы рабочых і сялян у Паўднёва-Усходняй Азіі — з'яўляюцца важным фактарам умацавання міру ў гэтым раёне. Працоўныя Беларусі, як і ўсе савецкія людзі, асуджаюць правакацыі пекінскіх гегеманістаў, заяўляюць аб сваёй падтрымцы і салідарнасці з брацкім в'етнамскім народам, аказваюць шырокую дапамогу ў сацыялістычным будаўніцтве.

Прадпрыемствы рэспублікі пастаўляюць у СРВ трактары, аўтасамазвалы, станкі, дакладныя прыборы і іншую прадукцыю.

На канферэнцыі выбран новы саставу праўлення Беларускага аддзялення таварыства. Старшынёй зноў выбраны міністр аўтамабільнага транспарту БССР Герой Сацыялістычнай Працы А. Андрэеў.

«ЗАХАД-81»

З 4 па 12 верасня на тэрыторыі Беларускай, Прыбалтыйскай ваенных акруг і ў акваторыі Балтыйскага мора пад кіраўніцтвам міністра абароны СССР Маршала Савецкага Саюза Д. Усцінава былі праведзены вучэнні войск і флоту Узброеных Сіл СССР «Захад-81». Вучэнні праводзіліся з мэтай удасканалення баявой зладжанасці, узаемадзеяння злучэнняў і часцей відаў і радоў войск. У іх прымалі ўдзел аператыўныя штабы, злучэнні і часці розных відаў Узброеных Сіл СССР.

Па запрашэнню міністра абароны СССР Д. Усцінава на вучэннях прысутнічалі таксама міністр абароны ВНР генерал арміі Л. Цінеге, міністр нацыянальнай абароны СРВ генерал арміі Ван Тыен Зунг, міністр нацыянальнай абароны ГДР генерал арміі Г. Гофман, першы намеснік Старшыні Дзяржаўнага Савета і Савета Міністраў, міністр Рэвалюцыйных узброеных сіл Рэспублікі Куба генерал арміі Рауль Кастра Рус, міністр абароны МНР генерал-палкоўнік Ж. Аўхіа, Старшыня Савета Міністраў, міністр нацыянальнай абароны ПНР генерал арміі В. Ярузельскі, міністр нацыянальнай абароны СРР генерал-лейтэнант К. Алцяну, міністр нацыянальнай абароны ЧССР генерал арміі М. Дзур, міністр народнай абароны НРБ генерал арміі Д. Джураў, першы намеснік міністра народнай абароны НРБ, начальнік генеральнага штаба БНА, генерал-палкоўнік А. Семярджыяў. На вучэннях прысутнічаў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі Ц. Кісялёў.

НА СЕСІЮ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АСАМБЛЕІ ААН

На XXXVI сесію Генеральнай Асамблеі ААН Савет Міністраў СССР зацвердзіў дэлегацыю СССР на чале з членам Палітбюро ЦК КПСС, міністрам замежных спраў СССР А. Грамыкам.

Савет Міністраў УССР зацвердзіў дэлегацыю УССР на чале з міністрам замежных спраў рэспублікі В. Мартыненкам.

Савет Міністраў БССР зацвердзіў дэлегацыю БССР на чале з міністрам замежных спраў рэспублікі А. Гурыновічам.

«БЕЛАРУСЬ» У ДАНІІ

Вялікім попытам карыстаюцца ў Даніі трактары і іншая сельскагаспадарчая тэхніка, выпушчаная ў Савецкім Саюзе.

Збытам прадукцыі сельскагаспадарчага машынабудавання з маркай «Зроблена ў СССР» тут займаецца гандлёвае дацка-савецкае акцыянернае таварыства «Дана — Беларусь». Хоць існуе яно ўсяго каля трох гадоў, за кароткі тэрмін таварыства набыло ў гэтай скандынаўскай краіне вядомасць і аўтарытэт.

Ужо звыш 1 500 трактароў «Беларусь» розных мадыфікацый працуюць на дацкіх палях.

Мясцовыя фермеры лічаць, што трактары «Беларусь» па сваіх тэхнічных характарыстыках — надзейнасці, прастаце ў кіраванні, эканамічнаму расходу гаручага, універсальнасці — адпавядаюць самым высокім міжнародным стандартам.

Прадстаўнікі дзелавога свету Даніі выступаюць за далейшае развіццё гандлёва-эканамічных сувязей з Савецкім Саюзам. Вопыт такога супрацоўніцтва паказвае, што яно выгадна абедзвюм краінам.

НАСЕННЕ НА ЭКСПАРТ

Калектыў Барысаўскага доследна-паказальнага лясгаса займаецца вырошчваннем элітнага насення дрэў хваёвых парод. Для гэтага створаны спецыяльныя плантацыі. Насенне, атрыманае тут, карыстаецца вялікім попытам. Яго ахвотна набываюць многія замежныя краіны.

Сёлета, напрыклад, шведскія лесаводчыя фірмы закупілі ў Барысаўскім лясгасе 900 кілаграмаў элітнага насення елак. Паступілі заказы і з іншых краін.

ВАКЗАЛ МЯНЯЕ АБЛІЧЧА

З усіх дзевяці маскоўскіх вакзалаў Беларускі — самы «міжнародны». Кожны дзень адсюль ідуць паязды ў Варшаву, Прагу, Берлін, Парыж, Лондан, Вену... Вакзал — адзін з буйнейшых на Маскоўскім чыгуначным вузле. Да 16 тысяч чалавек прымае і адпраўляе ён штосутачна. У апошні час ён змяніў сваё аблічча: значна расшырыўся, стаў больш добраўпарадкаваным. Тут праведзены вялікія рэстаўрацыйныя работы. Як паведамілі ў галоўным архітэктурна-планіровачным упраўленні Масквы, распрацаваны праект рэканструкцыі плошчы Беларускага вакзала. Плануецца яе расшырэнне, добраўпарадкаванне тэрыторыі, узвядзенне адміністрацыйных будынкаў і жылога комплексу, стварэнне новай транспартнай развязкі.

...І СКАЖУЦЬ НАШЧАДКІ «ДЗЯКУЙ!»

ПАКІНУЦЬ СЛЕД

ЖНІВЕНЬСКІЯ ранкі росныя, а яшчэ надзіва цёплыя...

Іван Жогла палюбіў іх, як толькі сябе помніць. Бывала, маці будзіць на світанку, каб не праспаў грыбы, а ён і сам напагатове. А за вёскай над жытнёвым полем ужо выплывае сонца і чырвонымі праменямі высвечвае таўшчэзныя копы саломы, ля якіх туляцца натомленыя за дзень камбайны. Жогла забярэцца на адзін з іх і пакручвае ў захапленні рулём, уяўляючы, нібыта гэта ён нароўні з дарослымі ўбірае хлеб...

«Хлеб — усяму галава»,— часта паўтарала маці і прывучала сына да руплівай працы на зямлі. То бульбу абагнаць даручыць, а то на сенажаць з сабою возьме... Але больш за ўсё ён любіў жніўны час. Работы ў калгасе ў такую пару хоць адбаўляй. І ў полі, і на таку — усім справа знаходзілася. Стараліся і яны, падлеткі. Хто сцірТаваў салому, хто ўвіхаўся ля сушылак, а найбольш пранырлівыя, дык тыя ля камбайнаў круціліся. Здаралася, гукне хто-небудзь са старэйшых: «А ну, давай да мяне ў памочнікі. Жыта жаць вучыць буду». І не было шчасця большага, чым вось гэта — сядзець за штурвалам машыны і малаціць хлеб...

Даўно гэта было, але тыя гады памятныя. І мо так добра разумее цяпер Іван Сяргеевіч вось гэтых хлопцаў, якія толькі што ўвайшлі ў яго кабінет. Калгасныя стыпендыяты, што вучацца ў сельскагаспадарчым інстытуце, — будучая падмога Жоглу. Прыехалі на практыку. А ў калгасе самае жніво. Вось і просяцца на камбайн. «Бач ты іх, настойлівыя», усміхаецца Жогла. Хаця ён некалі і сам вось так насядаў, калі вучыўся на інжынера ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі і прыязджаў на практыку ў вёску.

ЯМУ не было і трыццаці трох, калі стаў кіраваць калгасам, ды яшчэ такім вядомым на Случчыне, як «1 Мая». Перад ім тут быў Васіль Козел, Герой Сацыялістычнай Працы. Ён арганізаваў гэту гаспадарку, ён зрабіў калгас славутым на ўсю Беларусь.

Але трэба сказаць, што і Жогла прыйшоў у Навадворцы не навічком. Пасля заканчэння акадэміі працаваў на вёсцы інжынерам і працаваў добра. А потым яго вылучылі на пасаду галоўнага інжынера ўпраўлення сельскай гаспадаркі пры Слуцкім райвыканкоме...

І ўсё-такі, задумаўся Іван Жогла, калі заняў пасаду старшыні праўлення: раптам ды і не атрымаецца з яго кіраўнік? Ён жа добра разумеў, што ўсё тое, чаго дасягнуў калгас, трэба не толькі зберагчы, але і развіць далей. Было над чым падумаць. І пра старшыню загаварылі на вёсцы, што ён чалавек з галавой.

Паступова абнаўлялі тэхніку, фермы, грамадскі статак, сарты збожжавых замянялі больш перспектыўнымі. З першых дзён новы старшыня прыглядаўся да тых хлопцаў і дзяўчат, якія ўзначальвалі фермы, брыгады. Цікавіўся іх справамі, дапамагаў парадаю. А яшчэ наведваўся ў школы, гутарыў з выпускнікамі. Не, не агітаваў ён іх у калгас. Проста расказваў, як гэта выдатна, калі чалавек застаецца на зямлі сваіх бацькоў: вырошчвае хлеб, даглядае жывёлу... Калі ласка, выбірай работу па душы, па сэрцу. А мо хто пажадае падацца ў інстытут ці тэхнікум, калгас не адмовіць у дапамозе: вывучыць за свой кошт.

Жогла змог зацікавіць моладзь і не толькі добрымі заробкамі. Ён асабіста прымаў удзел у стварэнні ансамбляў і гурткоў мастацкай самадзейнасці. Не пашкадаваў грошай на музычныя інструменты, касцюмы для этнаграфічных груп... А ўзяць экскурсійныя паездкі па славутых мясцінах рэспублікі, калгасныя спартакіяды?!

«Не працай адзінай жыве чалавек»,— часта любіў гаварыць старшыня. Вунь колькі моладзі цяпер збіраецца ў клубах пасля рабочага дня. І праводзіць свой вольны час не горш, чым у горадзе.

А рабочай сілы ў калгасе цяпер хапае. Сёння ўжо не ад іх ідуць у горад, а з горада ў вёску. У гаспадарцы ёсць такая магчымасць даць людзям і работу, і жыллё. А гэта значыць, што яны пабагацелі за апошнія гады. Вось узяць, напрыклад, паказчыкі чатырохгадовай даўнасці. У калгасе тады збіралі па 3—4 тысячы тон збожжа, прадавалі 700—800 тон мяса і 3—4 тысячы тон малака. А цяпер? Толькі летась дзяржаве было прададзена 1 200 тон мяса і амаль 5 тысяч тон малака. Выраслі за гэтыя гады? Несумненна. Ды і зарабляюць цяпер больш. Жывёлаводы і механізатары атрымліваюць у месяц па 230—250 рублёў. А мільённыя даходы гаспадаркі даюць магчымасць штогод набываць новую тэхніку, адпускаць на ўсе віды сельскага будаўніцтва да паўмільёна рублёў.

ЗАВОД БУДУЕ... ЗАВОДЫ

Тэхнічнае пераўзбраенне многіх індустрыяльных гігантаў краіны — адна з галоўных задач, пастаўленых XXVI з'ездам КПСС. Важную ролю ў яе вырашэнні адыгрывае і калектыў Мінскага завода аўтаматычных ліній імя П. Машэрава, які стаў асноўным пастаўшчыком аўтаматычных ліній і агрэгатных станкоў для Волжскага, Камскага, Горкаўскага і Мінскага аўтазаводаў, «Ростсельмаша», трактарных заводаў у Валгаградзе, Харкаве, Мінску. У адзінаццатай пяцігодцы да іх дабавіцца шэраг новых прадпрыемстваў. Значна расшырацца сувязі па праграме СЭУ з заводамі сацыялістычных краін, а таксама з многімі фірмамі капіталістычных дзяржаў.

Прадукцыя з маркай Мінскага завода аўтаматычных ліній вызначаецца высокай якасцю, дакладнасцю і надзейнасцю ў эксплуатацыі. Больш як палавіна станкоў і ўсе аўтаматычныя лініі памячаюцца дзяржаўным Знакам якасці. Станкабудаўнікі няспынна іх удасканальваюць, аснашчаюць праграмна-кіруючымі сістэмамі, павышаюць клас дакладнасці і прадукцыйнасць, павялічваюць выпуск.

НА ЗДЫМКАХ: новая лінія пачынаецца з праекта. Вядучыя канструктары спецыяльнага бюро разглядаюць макет перспектыўнага абсталявання; слесар-электрамантажнік высокай кваліфікацыі Генадзь КАЛАШНІКАЎ; зборачны цэх завода; старшы інжынер В. КАЧЭРСКІ, загадчык лабараторыі А. КРУНЧУК і электрамантажнік Д. КЛІМОВІЧ у лабараторыі электронікі спецыяльнага канструктарскага бюро.

Фота У. ВІТЧАНКІ.

ШТО МОЖА КАМСАМОЛ

Калі некалькі гадоў назад Мінскі трактарны завод перабудоўваў вытворчасць для выпуску новай мадэлі, асвойваць яе было даручана рабочым-камсамольцам. Яны кантралявалі работу ўсіх участкаў, сачылі за якасцю зборкі машын, уносілі рацыяналізатарскія прапановы па ўдасканальванню найбольш працаёмкіх працэсаў.

Як і на кожным савецкім прадпрыемстве, на Мінскім трактарным заводзе, акрамя партыйнай і прафсаюзнай, дзейнічае камсамольская арганізацыя. Яна аб'ядноўвае больш чым 7,5 тысячы маладых рабочых. Кіруе ўсёй яе дзейнасцю перавыбіраемы штогод заводскі камітэт ВЛКСМ, які складаецца з 50 чалавек.

Акрамя ўдзелу ў вырашэнні вытворчых праблем, камітэт займаецца і іншымі, самымі рознымі пытаннямі. Сакратар камітэта Яўген Янковіч жартам заўважае: «Лягчэй пералічыць, што не ўваходзіць у абавязкі камсамольскай арганізацыі». Тут і чыста бытавыя праблемы — размеркаванне месц у рабочых інтэрнатах і адпачынак моладзі. Разам з прафкомам камітэт камсамола размяркоўвае путёўкі ў санаторыі і на курорты; сочыць за павышэннем узроўню адукацыі і кваліфікацыі маладых рабочых; кантралюе выкананне працоўнага заканадаўства, якое прадугледжвае шэраг ільгот для тых рабочых, якім яшчэ няма 18 гадоў: скарочаны рабочы дзень, работа толькі ў дзённую змену, прадастаўленне водпуска ў летні час.

Адной з галоўных сваіх задач камітэт лічыць арганізацыю сацыялістычнага спаборніцтва сярод моладзі. «На нашым заводзе спаборнічаюць не толькі маладзёжныя брыгады, але і калектывы цэлых цэхаў, — расказвае Яўген Янковіч. — Моладзь дзеліцца адзін з адным вытворчымі «сакрэтамі», могуць стаць за станок таварыша, які захварэў, папрацаваць «на рахунак» іншага калектыву». Нядаўна на Мінскім трактарным заводзе быў створаны новы універсальны трактар павышанай магутнасці. І зноў шэфства над укараненнем і асваеннем мадэлі вырашана даручыць маладым рабочым.

Н. БУЛДЫК.

Так, калгас «1 Мая» не здаў сваіх пазіцый і сёння ў ліку лепшых у Слуцкім раёне. Ён адзін з буйнейшых у сельскагаспадарчай вытворчасці. Вядома, вельмі многае залежыць ад таго, хто кіруе гаспадаркай. Але Іван Жогла ніколі не пагодзіцца, што ён адзін усяму галава. Ён у першую чаргу пакажа на сваіх памочнікаў. Усе яны маюць спецыяльную адукацыю: хто тэхнікум закончыў, а хто інстытут. Вось, напрыклад, начальнік вытворчага ўчастка (у састаў уваходзіць некалькі паляводчых брыгад і ферм) Міхаіл Русаковіч. Ён аграном, мае вышэйшую адукацыю. Вяскоўцы паважаюць яго, цэняць за разваротлівасць. Альбо ўзяць Міхаіла Талацінніка. Закончыў тэхнікум, атрымаў спецыяльнасць агранома, а цяпер узначальвае адну з лепшых брыгад.

Так, без навукі сёння ў сельскай гаспадарцы нельга. Каб атрымаць высокі ўраджай збожжавых або бульбы ці буракоў, мала ўжо проста пасеяць, пасадзіць. Патрэбна добра ведаць, і як гэта зрабіць, у якія тэрміны, якімі сартамі. Раней на яго Капыльшчыне, і гэты час Жогла добра памятае, у іх вёсцы брыгадай камандаваў малаадукаваны дзядзька Фёдар. Ды што там брыгадзір! У старшыні, і таго за плячыма не больш сямі класаў было. Мо таму і ўраджаі нізкія збіралі, задавальняліся самым малым. Цяпер жа, каб камандаваць брыгадай, і дзесяцігодкі мала. Вось і вучацца людзі.

СЁЛЕТНІ год ураджайны. Збажына ў пояс. Каласы важкія. За трыццаць цэнтнераў у калгасе намалочваюць. Ёсць участкі, якія даюць у паўтара раза больш, асабліва радуюць яравыя... Нечакана зазвінеў тэлефон. Так і ёсць. Гэта Мікалай Кацель з Працавіч. Там нядаўна лазнепральны камбінат калгасны заклалі. Гэта, каб гаспадыні з бялізнай дома не валаводзіліся. Ды і цырульня свая будзе, лазня. Навошта ў горад ездзіць, хоць ён і пад бокам. Дык вось будаўнічыя матэрыялы патрэбны. Ведае Кацель, што старшыня з ранку ў канторы, і насядае. Жогла слухае ўважліва, нешта запісвае. Абяцае:

— Бетон сёння будзе. Даём два самазвалы. І цэглу падвязём.

Жніво жнівом, а ў будаўнікоў свае клопаты... А недзе за Навадворцамі праз расчыненае акно добра чуваць гул камбайнаў. Гэта падсохла трава, і машыны выйшлі ў поле... Пара і старшыні...

Дарога на Івань гравіем сланая, роўная. Старшынская легкавушка бяжыць лёгка, без натугі. Нездарма, выходзіць, грошы на дарогі трацілі. Сто тысяч у год! Не жартачкі. Затое цяпер — раскоша. Ніякі дождж табе не перашкода.

Івань — вёсачка невялікая, двароў на пяцьдзесят. Вуліцы чыстыя, падсыпаныя. Дамы шлакабетонныя, цагляныя... Расказваюць, некалі тут стаяў радзівілаўскі маёнтак. А яшчэ грозны князь трымаў у Івані чалавек трыццаць варты. Гэта каб заморскія купцы не маглі на слуцкія базары трапіць. Дык вось аднойчы, калі вартаўнікі моцна спалі, гэты ахоўны заслон мінаваў турэцкі абоз... Раз'юшаны магнат загадаў тады ўсю варту пасекчы. І сёння непадалёку ад вёскі віднеецца курган... Вунь... А за ім поле. Машына бяжыць міма аблогі, што за ляском, а там — нацянькі. За прагалінай спыняецца. Тут ужо камбайны жнуць пшаніцу.

А сонца ў полі пячэ няшчадна. Збажына пажоўклая, важкім коласам гнецца долу: у ёй і радасць, і шчасце хлебаробскае... Старшыня бярэ на далоні зерне і цешыцца. Добры ўраджай вырас! Не менш шасці тысяч тон павінны намалаціць! І камбайнеры як працуюць! Стараюцца ўбраць усё да каласка. Вядома, у калгасе за работу іх не пакрыўдзяць: не толькі добра заплацяць, але лепшым і прэміі выдадуць, путёўкі ў дамы адпачынку, зерня кожнаму па паўтоне...

МАШЫНА выскачыла на асфальт. Іван Сяргеевіч уключыў прыёмнік. Голас дыктара якраз перадаваў спартыўныя навіны. Слухае, бо балельшчык. Бывае, па справах трапіць у Мінск, і калі ў гэты дзень футбол, стадыён не праміне. І ў калгасе футбол не на апошнім месцы. А яшчэ моладзь любіць валейбол, лёгкую атлетыку... Грошы ж для развіцця спорту ёсць. Марыць аб стадыёне ў вёсцы Кірава, гэтак месц на тысячу.

Увогуле, вёска гэта перспектыўная. Менавіта тут мяркуецца пабудаваць гандлёвы цэнтр з магазінамі, сталовай і нават з рэстаранам. Жогла хоча, каб рэстаран быў не горшы, чым у горадзе. З нацыянальнай кухняй, з прыгожымі афіцыянткамі... Адведзена месца ўжо і для будаўніцтва дзіцячага сада-ясляў, новай канторы праўлення. У самым цэнтры будуць узводзіцца жылыя дамы для калгаснікаў, як цяпер кажуць, з усімі камунальнымі выгодамі...

Пабываў у гэты дзень Іван Сяргеевіч і на кляпчанскім полі, і ў вёсцы Ігравева, зазірнуў у Працавічы. Цяпер увесь калгас як на далоні. І вось ужо легкавушка, уся запыленая і разагрэтая на сонцы, імчыць да Навадворцаў. Вечарам — пасяджэнне праўлення. Пытанняў назбіралася шмат. І галоўныя сярод іх — сяўба азімых, уборка бульбы. Трэба ўсё абдумаць.

Клопаты... Іх нямала ў старшыні калгаса. І яны не палохаюць яго. Вядома, многае з таго, што задумана, яшчэ не зроблена. Але ён верыць у заўтрашні дзень. І яшчэ ў тое, што настане такі час, калі і пра яго скажуць, як гавораць цяпер пра Васіля Козела: во гэту дарогу сыпалі пры Жоглу і гэту во... І вунь той комплекс, і Палац культуры пры Жоглу будавалі.

Ён хоча пакінуць пасля сябе добрую памяць.

Яраслаў СІДОРЫН.

НЕЙТРОННОЕ ОРУЖИЕ—УГРОЗА МИРУ

Решение президента США Рональда Рейгана начать производство нейтронных боеголовок всколыхнуло общественное мнение, пожалуй, всех стран. Этот шаг американской администрации не находит поддержки у многих политических деятелей и руководителей государств, его отвергают трудящиеся как Западной Европы, так и американского континента. Советские люди, в чьей памяти еще хранится пережитое и выстраданное в Великой Отечественой войне, едины в своем стремлении сохранить мир на земле. Жители городов и деревень, люди умственного и физического труда, старики и молодежь, атеисты и верующие — весь наш народ глубоко возмущен неразумными, безответственными действиями правящих кругов Соединенных Штатов Америки. Мы призывали всегда и призываем сейчас отказаться от новых, еще более грозных видов оружия. Судьбы мира—в наших руках. Этими мыслями проникнуты и Заявление епископа Пинского, викария Минской епархии Афанасия, и Обращение пресвитерского совета евангельских христиан-баптистов Белоруссии, которые мы публикуем ниже.

ЗАЯВЛЕНИЕ

ЕПИСКОПА ПИНСКОГО, ВИКАРИЯ МИНСКОЙ ЕПАРХИИ АФАНАСИЯ

Не занимаясь политикой, мы не можем оставаться в изолированных рамках религиозной жизни, когда над миром нависает ядерная катастрофа — надвигается гроза истребительной ядерной войны и создается угроза для всего человечества. Решение президента США Рейгана начать производство нейтронного оружия вызвало широкую волну протеста на всей планете.

Наша религиозная совесть предупреждает всех поджигателей войны: смотрите, берегитесь сделать роковой шаг, ибо тогда будет уже поздно — дух войны, вызванный из преисподней, не уйдет обратно до тех пор, пока поднявший меч не погибнет от меча! (Мф. 26, 52).

Опасность войны требует напряженной борьбы с ней. Необходимо всем защитникам мира заботиться о еще большей концентрации сил мира и таким образом поставить упорствующих перед убедительным аргументом единства народов. Нужно убеждать, протестовать, сопротивляться военным приготовлениям, нужно беспрерывно стучаться в запертые двери ожесточенных сердец, склоняя их к переговорам, к взаимным уступкам (Мф. 7, 7). Солидарность верующих всех религий, и особенно христиан, может сыграть здесь немаловажную роль. Если добиться еще большей консолидации сил мира, то они, действуя решительно, могут совершенно изменить ход событий. Эта уверенность и подвигнула Святейшего Патриарха Московского и всея Руси ПИМЕНА обратиться с призывом провести Всемирную Конференцию руководителей и других видных деятелей религий мира, которая была бы посвящена сохранению жизни от ядерного уничтожения.

Оправдывая веру поведением и делами (Иак. 2,14 и 26), и мы, православные белорусы, в союзе с верующими всех других церквей и религий, можем благоприятно повлиять на разрешение проблем, разделяющих человечество, и тем самым помочь человечеству спасти дело мира. Война должна быть побеждена и будет побеждена великой могучей силой всего миролюбивого человечества.

Мир — это вожделенная цель наших упований. И эта цель объединяет в нашей стране всех людей, верующих и неверующих, в одну огромную гражданскую семью.

«Отстоять мир, — говорил Л. И. БРЕЖНЕВ на XXVI съезде КПСС, — нет сейчас более важной задачи в международном плане для нашего народа, да и для всех народов планеты». Эти слова особо весомо звучат сегодня.

9 июля с. г. Святейший Патриарх Московский и всея Руси ПИМЕН выступил с заявлением, в котором высказал глубокую озабоченность состоянием международной обстановки. От имени епископата, клира, монашествующих и верующих Русской Православной Церкви была высказана всецелая поддержка Обращению Верховного Совета СССР «К парламентам и народам мира» и надежда, что парламентарии всех стран мира должным образом воспримут высокое гуманистическое содержание этого документа.

Хотя мы и веруем, что дело войны и мира—в руках Божиих (Пс. 35,7; Рим. 11,33), но пока войны нет, мир в известном смысле находится в наших человеческих руках. Это значит, что мы можем удержать, укрепить и продлить его в той мере, в какой мы послужим этому святому делу. «Блаженны миротворцы, ибо они будут наречены сынами Божиими», — завещает всем нам Господь наш Иисус Христос (Мф. 5,9).

Вот почему Русская Православная Церковь со времени окончания второй мировой войны не уставала обращаться к христианам и верующим других религий всего мира с призывом к единению, с призывом помочь народам в искании того мира, который должен быть предметом нашей постоянной заботы и деятельности.

В Заявлении Патриарха Московского и всея Руси ПИМЕНА от 9 июля 1981 года Русская Православная Церковь снова и снова взывает к религиозной совести — ждет от христианских церквей и верующих всего мира единых действий во имя того Мира, который завещал нам Бог.

ЕПИСКОП ПИНСКИЙ,
ВИКАРИЙ МИНСКОЙ ЕПАРХИИ
АФАНАСИЙ

4 сентября 1981 г. город МИНСК.

СОЕДИНЕННЫЕ ШТАТЫ АМЕРИКИ, ВАШИНГТОН, БЕЛЫЙ ДОМ ЕГО ПРЕВОСХОДИТЕЛЬСТВУ ПРЕЗИДЕНТУ США Р. РЕЙГАНУ

ОБРАЩЕНИЕ

Уважаемый господин Президент!

Мы от имени десятков тысяч верующих баптистов и пятидесятников Белорусской Советской Республики, объединенных сотрудничеством в служении Богу, обращаемся к Вам по вопросу жизни, которую Христос принес на землю (Иоан. 1, 4; 6, 33).

Во имя Бога мы просим Вас: снимите с производства смертоносное оружие — нейтронную бомбу, которая несет смерть миллионам детей, подросткам и людям старшего возраста.

Нам, белорусам, свежо воспоминание о тех бедствиях и ранах, которые нашему народу принесла ВТОРАЯ МИРОВАЯ ВОЙНА.

Не жалея сил и здоровья, наш народ трудился, залечивая раны войны.

Сегодня восстановлены наши города из руин, поднято наше сельское хозяйство, народ белорусский живет счастливой жизнью, нашим детям неизвестны ужасы войны, и теперь, когда идет речь о нарушении сохранения мира на земле, мы не можем оставаться равнодушно в стороне.

Мы просим Вас, во имя Бога, все сделать для того, чтобы сохранить мир на земле и снять с производства нейтронное оружие.

Каждому человеку придется стать пред Богом и дать отчет за свои деяния, совершаемые здесь на земле (2 Кор., 5, 9).

Верим, что Всемогущий Бог даст Вам мудрость к содействию сохранению мира для счастья всех народов.

Да будет удалено и уничтожено, что несет смерть человечеству. (Исаия 2, 4).

Ожидаем в этом и Вашего содействия господин Президент.

ПРЕСВИТЕРСКИЙ СОВЕТ ЕВАНГЕЛЬСКИХ ХРИСТИАН-БАПТИСТОВ БЕЛОРУССИИ

2 сентября 1981 года.

И. БУКАТЫЙ
Л. ВЛАДЫКО
О. СКУРАТОВИЧ

Што? * Як? * Чаму?

Ананімны чытач з Аўстраліі даслаў нам выразку з нейкага англамоўнага часопіса. На здымку, перадрукаваным, відаць, з «Настаўніцкай газеты», — вучні ў класе вывучаюць сучасны карабін. Пад здымкам подпіс ад рэдакцыі: «Мілітарызацыя ў Савецкім Саюзе пранікла нават у школу...» Ад сябе ж аўтар пісьма дадаў толькі адзін радок: «Як жа гэта так: самі нібыта выступаеце за мір, а дзяцей змалку да зброі прывучаеце?..» Не ведаючы адраса чытача з Аўстраліі, мы наважыліся растлумачыць на старонках газеты і яму, і ўсім, у каго можа ўзнікнуць падобнае пытанне, што такое

ВАЕННА-ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ

Але перш, чым адказаць на пастаўленае пытанне, хацелася б зрабіць адну заўвагу ў адрас і таго часопіса, выразку з якога мы атрымалі, і ўсіх падобных выданняў. Не ўпершыню сродкі масавай інфармацыі Захаду імкнуцца давесці свайму збітаму з панталыку, атручанаму ядам ілжы чытачу, што Савецкі Саюз некаму пагражае, што наша рашучасць ураставаць свет ад вайны — усяго толькі прапагандысцкі лозунг. Не ўпершыню таксама перадрукоўваюцца з нашых выданняў здымкі савецкіх воінаў у розных варыянтах ці то юнакоў на занятках у гуртках Добраахвотнага таварыства садзеяння арміі, авіяцыі і флоту з адпаведнымі каментарыямі: Савецкі Саюз хоча заваяваць увесь свет. Нам здаецца, калі даказваць падобны тэзіс, то лепш пачынаць не са школы, а з... дзіцячага сада. Там жа дзеці гуляюць з алавянымі і больш сучаснымі — пластмасавымі салдацікамі, з такімі ж шаблямі і карабінамі. Вось адкуль пачынаецца «мілітарызацыя» савецкага грамадства!

А што адбываецца ў школе? Там вучні 9—10 класаў праходзяць пачатковую ваенную падрыхтоўку. Курс гэты зацверджаны Міністэрствам асветы, і ніякай таямніцы тут няма. Так што ўсё на дасланым здымку, як кажуць, адпавядае сапраўднасці, акрамя подпісу. Ён — прапагандысцкі стэрэатып буржуазнай прэсы.

Хлопцы, якіх праз год-два прызавуць на вайсковую службу, павінны прыйсці ў армію падрыхтаванымі. І можа не столькі дасканала авалодаць сучаснай зброяй, колькі ўсвядоміць, для чаго гэта зброя даецца юнаку. Вось тут якраз і хаваецца той маленькі фальш наконт «мілітарызацыі» савецкага грамадства, «агрэсіўнасці» камунізму і да т. п.

Чалавек з ружжом у любой капіталістычнай дзяржаве — гэта сімвал насілля і агрэсіі. Супраць каго ён паверне зброю? Супраць неграў Маямі ці Новага Арлеана? Супраць патрыётаў Сальвадора? Супраць краін Персідскага заліва, які амерыканскі імперыялізм аб'явіў зонай сваіх «жыццёва важных інтарэсаў»?

Такі ж стасунак да чалавека з ружжом быў некалі і ў нас, у Расійскай імперыі. Але сацыялістычная рэвалюцыя дала зброю працоўным масам, і чалавек з ружжом стаў сімвалам абароны інтарэсаў рабочага класа, беднага сялянства, заваёў Вялікага Кастрычніка.

І ў дзіцячым садзе, і ў школе, і ў арміі мы выхоўваем не заваёўнікаў, а абаронцаў Радзімы, не мілітарыстаў, а свядомых барацьбітоў за мір, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне прыгнечаных. Мы вучым сваіх дзяцей, сыноў і дачок любіць нашу агульную Радзіму — Савецкі Саюз, быць гатовымі абараніць яе ад любога ворага. Нідзе: ні ў школьных праграмах, ні ў прысязе воіна Савецкай Арміі — вы не знойдзеце і намёку на нейкія заклікі да агрэсіі, заваявання іншых народаў і чужых зямель. Толькі свая Радзіма, толькі ахова яе свяшчэнных рубяжоў і мірнай працы свайго народа — вось дзеля чаго мы вучым моладзь авалодваць зброяй.

Гэта і ёсць ваенна-патрыятычнае выхаванне.

Наш ананімны чытач, напэўна, страціць прытомнасць, убачыўшы ганаровую варту ў Брэсцкай крэпасці ці Валгаградзе. Як?! Хлопчыкі і дзяўчынкі са зброяй у руках маршыруюць да Вечнага агню і застываюць перад ім у маўчанні? Гэта — жахліва!.. Дзеці — і зброя? Гэта несумяшчальна!

Гэта — высакародна, адкажам мы, бо ў дзецях нашых жыве памяць пра загінуўшых, бо яны, якія нарадзіліся ў мірны час, ведаюць, што прынёс нашаму народу гітлераўскі фашызм і што значыць вайна. Тым больш, калі яны трымаюць у сваіх дзіцячых руках, як, напрыклад, у Валгаградзе, зброю абаронцаў Сталінграда. Зварот да гераічнага мінулага краіны — гэта таксама адна з часцінак агульнага працэсу: фарміравання ў моладзі савецкага патрыятызму, гатоўнасці ў любы момант мужна абараніць Айчыну.

Вядома, нашым ідэалагічным «дабрадзеям» на Захадзе хацелася б, каб савецкая моладзь менш або зусім не цікавілася гераічнай гісторыяй свайго народа, а больш джынсамі і мадэрнай музыкай, каб у нас раслі не грамадзяне, якія ўсвядомліваюць свой абавязак перад Радзімай, а безыдэйныя абывацелі, спажыўцы.

Але мы заўсёды помнім словы У. І. Леніна, заснавальніка нашай дзяржавы: «Усялякая рэвалюцыя толькі тады чаго-небудзь варта, калі яна здольна абараніць сябе». Гэты запавет мы будзем перадаваць з пакалення ў пакаленне. Краіна Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі павінна ўмець абараніць сябе. Іншых мэт у нашай дзяржавы не было і няма.

'MX-IZATION' OF THE NUCLEAR RISK

By Gennady GERASIMOV

THE US National Security Council held its recent visiting session in Los Angeles. The well-nigh most inportant subject for discussion was the question where to deploy the now designed new MX intercontinental ballistic missiles, each of which is as high as a 6-storey house, weighs 96 tons and carries ten warheads. The **Time** weekly called this question "a severe political migraine" for Ronald Reagan's administration. The decision must be made urgently because both the Houses of Congress decided not to take the needed allocations until the President informs them where exactly he intended to deploy the MX missiles. The Congress also reserved for itself a full 60 days for its own thinking about the decision taken by the President.

There are about 30 different versions for MX deployment. The preceding, Jimmy Carter's administration intended to build 200 missiles and 4,600 launching silo-shelters in Nevada and Utah and to play hide-and-seek with them. The idea was to move the missiles from one silo to another, to keep the enemy guessing in which of the 23 possible silos this or that missile is at the rpesent moment. The question "maybe he couldn't care less where it is?" was not posed.

Presidential candidate Reagan regarded this plan "technologically dubious and ridiculously expensive", and also ecologically harmful. Now he has to come up with a version of his own. Caspar Weinberger, the Secretary of Defense, appointed a special research group which had to give him its recommendations in July. But they were given only a month later.

In the interim the US press wrote a lot about deploying the missiles on aircraft. Special heavy planes would circle in the skies round-the-clock waiting for the signal to drop the missiles on parachutes and they would orient themselves, by the sun or the stars, towards their targets.

The other versions included hauling the missiles along motorways by tractors, along railroads in railway trucks, on water, deploying them underwater in shallow and deep places and in mountain ranges, preferably on southern slopes, for the enemy's missiles are expected to arrive from the north...

The US Administration is now intensely concentrating on adopting a decision of paramount importance which entails a multibillion spending. Which version would be given preference? The **Washington Post** laid bare the crux of the matter, saying that the various "defence contractors who have strong and differing interests in the various alternatives, are also lobbying energetically in the conflict" in the course of what is "one of the fiercest battles of the Administration".

The question as to whether this deployment at all necessary in the first place, was squashed completely in the arguments about the various versions of the deployment.

The initial explanation for the reasons why the MX missiles had to be developed was the reference to the "growing vulnerability" of the Minuteman and Titan US land-based ICBMs of the previous generation. Today this explanation is accepted as an axiom, even though it was never proven. Here are some posisble objections to it:

Firstly, the Soviet side is not preparing a "first strike".

Secondly, land-based ICBMs are only a part of the US strategic "triad". Even if they should suddenly vanish overnight, the USA would have enough submarine- and aircraft-based missiles to inflict "unacceptable damage", as they say in Pentagon, on the enemy.

Thirdly, even a theoretical "disarming" strike on land-based ICBMs — the number of which exceeds 1,000 — is hardly feasible. The **Strategical Review**, a rather conservative US military magazine, for example, wrote in its latest issue, that many retired generals and admirals, as well as civilian experts say that neither Soviet nor US missiles were adequately accurate to deliver such a precision-targeted first strike. In that case why bother with the MX at all?

According to the armchair strategists in Pentagon all this colossal scheme has been plotted to secure the PLU, i.e., "preservation of local uncertainty" in the enemy's mind as to the whereabouts of the missiles. The paradox is that the Pentagon is by no means certain that its plan could be a success.

All this looks farfetched and abstract in the extreme — a monstrous parasitic growth on the idea on the "Soviet threat". But this lasts only as long as one believes the statements on the PLU being the sole aim of the entire project. However, military experts point out that the new ICBMs possess a first-strike capabiliy. The Council on Economic Priorities has recently published the report on unsubstantiated spending — an analysis of the proposed MX system. The report considers the official arguments in defence of this system and arrives at the conclusion that the USA did not need the MX missile at all. It then goes on to say that the Council arrived at the conclusion, that the aspiration for developing a missile for a strike at the enemy's means of attack, was the main motivation for developing the MX missile.

A "strike on the enemy's means of attack" is, of course, a first strike, before these means have been used. That is how MX serves the Pentagon's scenarios for a nuclear war, increasing the chances for its breaking out. The "MX-ization" of the nuclear risk is tantamount to 'maximization" of a nuclear conflict risk.

A quiet morning. (The White Lake, Grodno region). *Photo by A. PEREKHOD.*

NATURE PROTECTION

The Byelorussian SSR pays much attention to the protection and improvement of the human environment and rational use of natural resources.

The general principles of natural and environmental protection are provided by the Constitution of the Byelorussian SSR. Article 18 of the Constitution says that "In the interests of the present and future generations, the necessary steps are taken in the Byelorussian SSR to protect and make scientific, rational use of the land and its mineral and water resources, and the plant and animal kindoms, to preserve the purity of air and water, ensure reproduction of natural wealth, and improve the human invironment".

In addition there are some specific laws — the Laws on the Protection of Nature, of the Purity of the Atmosphere and the Animal Kindom, the Land, Mineral and Water Codes and others.

A large scale of measures aimed at natural protection is envisaged in "The Guidelines of Economic and Social Development of the USSR for 1981—1985 and for the Period ending in 1990". It is planned to improve the protection of nature, to realize a large scale of work directed at the reduction of air and water pollution, rational use and recultivation of land, construction of purification installations, elaboration and implementation of new low waste technology, closed water-circulating systems, sharp decrease of wastes, sanitation of urban territories.

In 1980 capital investments for the rational use of natural resources and environmental protection in the Republic amounted to 238 million roubles. And in the Tenth Five-Year Plan (1976—1980) the state allocations for nature protection measures (including land reclamation) totalled more than 1 billion roubles.

The protection of nature and rational use of natural wealth are one of the most important economic and social tasks.

Corresponding measures on natural protection are planned and realized in all branches of Byelorussia's national economy. Socialist emulation for rational and solicitous use of natural resources is increasing in its scope from year to year and involving an ever growing number of people.

In 1980 Minsk, Osipovichi and the Mosty region among rural regions became winners of this movement in the Republic. For the achievement of high quantitative and qualitative results in nature protection measures, the winners were awarded the Red Banners of the Central Committee of the Communist Party of Byelorussia, the Council of Ministers of the Byelorussian SSR, the Byelorussian Republican Council of Trade Unions and the Central Committee of the Lenin Young Communist League of Byelorussia, as well as honorary diplomas and money bonuses.

The Council of Ministers of the Byelorussian SSR has issued "The Red Book of the BSSR", which includes a list of rare plants and animals in extinct deserving special protection.

More effective measures are carried out to combat water and wind erosion. Scientific methods are applied in the implementation of largescale land-reclamation work. This will be intensified within the next few years. In the Eleventh Five-Year Plan (1981—1985) it is planned to drain 480,000—420,000 hectares of wet-and marsh-ridden land, to increase the production of anti-erosion machines. It is invisaged to recultivate about 60,000 hectares of land.

The Byelorussian SSR takes an active part in international cooperation in environmental protection. It is a member of the Governing Council of the United Nations Environment Programme since 1979. The Byelorussian SSR was a sponsor of the UN General Assembly resolution 35/8 "Historical responsibility of States for preservation of nature for the present and future generations" which linked the necessity of international cooperation in the field of nature protection with the ending of the arms race, consolidating and developing international detente and the creation of conditions which would banish war from the life of mankind.

WHAT? HOW? WHY?

What is the Difference?

How do Soviet trade unions differ from unions in the West? Can they call strikes?

Andreas SCHOLZ
(FRG)

First of all, Soviet trade unions operate in entirely different conditions. They operate in a socialist society where the land, banks, factories and transport are the property of the entire society. A director of a Soviet enterprise does not represent private owners (in the West, these can be even foreign owners); he manages the enterprise IN THE INTERESTS OF THE ENTIRE SOCIETY. He is also a member of the local trade union and is answerable to it.

In this kind of situation it is EASIER for Soviet trade unions to operate, because, as Bernard Shaw pointed out, "what we call peace is civil war between rich and poor conducted by disastrous strikes" against private enterprise, whose interests are incompatible with the interests of the workers. But it is also HARDER to lead Soviet trade unions since they have far greater rights and their field of activity is far more extensive than that of any trade union organization in the West.

It would be well-nigh impossible to find one single question of vital interest to the workers decided without the Soviet trade unions being directly involved. Let us list some of their rights:

— the trade unions supervise the administration's observation of the Labour Code (trade unions in the West do not have this right);

— a worker cannot be dismissed without the written consent of the TUC (Western trade unions do not have this power of veto);

— trade unions are directly involved in production management in all its aspects — planning, production costs, quality of finished items, distribution of profits, rate-setting, etc. (the private owner does not let the union even in sight of most of these things; many of them are hidden from the enterprise staff);

— trade unions can express lack of confidence in a certain administrator if he fails to abide by the Labour Code. This means only one thing for the administrator — dismissal from his post (unions in the West do not have this power);

— trade unions control how the administration implements labour safety standards. Specifically the trade union technical inspection bodies have the power to close down a section, a shop or an entire enterprise if standards are flagrantly ignored. And where plants are shut, workers receive their wages in full (unions in the West do not have this right);

— the local trade union branch has a decisive say in distributing housing (in the West, unions are naturally not involved in this because they have nothing to distribute);

— trade unions administer all the funds allocated in the state budget for social security — more money than is spent on defence (unions in the West have never had similar rights);

— trade unions manage the extensive network of holiday homes guest homes, sanatoriums and disease-prevention sanatoriums (the Western trade unions have never had this as a concern and on such a scale);

— trade unions organize children's summer recreation at Young Pioneer camps (trade unions in the West do not have the opportunity to do this);

Can Soviet trade unions call strikes? There is no law in the USSR prohibiting them from doing so. But there are no reasons for calling strikes either. What sparks most of the strikes in the West is the arbitrary firing of workers (trade union militants included), inflation, rising prices for staples, gas, electricity, etc. These phenomena don't occur here. A Soviet trade union can solve any problem without resorting to this extreme measure.

НЕРУШ

Віктар КАЗЬКО

УРЫЎКІ З РАМАНА

[Заканчэнне. Пачатак у № 36].

ПА КРУЗЕ ДАРОГА

Балота кранулася ў дарогу, як толькі асушылі Чортаву прорву. Але калі яно зрабіла першы крок, ніхто не прыкмеціў. І як было прыкмеціць: першы год сваіх блуканняў яно нічым — ні багнай, ні тванню, ні вадой, ні трыснягом — так і не выкрыла сябе. Падкралася да дамбы, да той новай дарогі, што была цяпер пракладзена да Балоні і далей, на Войціна, падкралася і замерла каля дамбы, ля насыпу, радуючы вока жоўтымі ірысамі, што зацвілі не ў пору, праўда, ужо недзе па восені. Потым ірысы адцвілі, прыйшла зіма. І зімой, нябачнае пад снегам, балота прашылася праз насып. І цяпер ірысы зацвілі вясною, як і павінна тое быць, але па другі ўжо бок насыпу. І толькі зацвілі, а адцвісці ім не дадзена было. Што за работа ішла там, пад зямлёю, што за буча кіпела там, таксама невядома. Нічога на паверхню, на святло з глыбі сваёй зямля не паказвала. Здавалася, і няма нічога там, углыбі, патаемнага, усё навідавоку. І навідавоку ўсё было, як і дагэтуль, зеляней Махахееў дубняк, яго хоць і моцна пашчыпала, але ён усё ж ацалеў, пакорліва, зрэзаная канавамі і прамавугольнікамі, ляжала ўтаймаваная Чортава прорва, ярыліся ў гэтых прамавугольніках і квадратах пшаніца і жыта, выганяючы на радасць людзям буйны і важкі колас. Усё было на радасць, усё было дарэчы чалавеку, Мацвею Роўду. Усё вакол было не толькі пераўтворана, але і ўпрыгожана хлебам, тая самая клятая і гібельная зямля, якой і назвы іншай не знайшлі, як толькі Чортава прорва.

Але разам з гэтым прыемным і зразумелым адбывалася на гэтай зямлі і нешта непаразумелае. Недарэмна кажуць: агонь цар, ды царыца вада. Пасля дажджоў, што прайшлі ў маі і зноў жа радавалі, балотца, што ўтварылася нечакана па другі бок насыпу, раптам знікла, вільнула ўбок, так што ў ірысаў і насенне не выспела, а балотца, калі ўжо выявіла сябе, пакрочыла ўжо больш бойка, пакідаючы за сабою цяпер ужо і сляды. Сляды гэтыя хаця і не пагражалі вялікімі стратамі ўраджаю, былі бачныя на полі, там-сям бачныя былі і правалы, і зрушэнні, і белыя праплёхі сярод тлустых тарфянікаў, нібы скрозь гэтую збажыну пратачыўся і лена сцёгся да дубнякоў невялікі паўпадземны ручай.

Перабраўшыся цераз насып, балота пакружыла па палях і прыбілася да дубняку. І дубняк на вачах пачаў чэзнуць, марнець, у лістоце яго, сярод каранёў, што гнілі і адміралі, раптам з'явілася вялікае мноства камароў, мошак і іншай погані. І камары ўсе былі вялізнымі, што бамбавозы, але і спрытнымі, лёталі бязгучна і не кусалі, а джгалі. І не кожны цяпер наважваўся зазірнуць у дуброву. Хаця, прынамсі, нечага цяпер і рабіць было там людзям, грыбы ў дубняку звяліся, суніца вырадзілася ў нейкую даволі брыдкую і агідную траўку, на якой ні ягады, ні ліста, адзіная толькі голая і чорная сцяблінка, у такія ж голыя і непрыемныя воку сцяблінкі вырадзіліся ўсе цяпер і ягады, і травы ў дубняку. Адно толькі калючае і ўчэпістае сцябло засталося і ад ажыннікаў, якімі некалі быў славуты дубняк.

Балотца, што пачало вандраваць, было літасцівым да пшаніцы і жыта. Вада-царыца мудра і ашчадна абышлася з хлебам, яна ўзяла толькі тое, што неабходна было ёй, каб прайсці, прарвацца да дубняку. Але, ідучы на гэты свой прарыў, змагаючыся за сваё жыццё, яна мілавала, шкадавала зямлю, ушаноўвала тое, што на ёй расло. І пшаніца, і жыта стаялі сцяной, на іх княжборцы хадзілі глядзець, як на дзіва нейкае.

— Мо табе, Мацвей, ужо Героя дадуць,— гаварыў дзед Дзям'ян свайму ўнуку.— Не медальку, як раней, а зорачку.

— Дадуць, дзед, дагоняць і яшчэ дадуць.

— Гэта ў нас могуць,— дзед Дзям'ян як аддаўляўся ад сваіх слоў і Мацвея, увесь, пэўна, у сваіх даўніх вёснах, узважваў на далоні цяжкі колас, вылушчваў з яго зярняты, лічыў іх, пераводзіў у грамы, цэнтнеры і тоны, але збіваўся і губляўся перад амаль што фантастычнай яму неахопнасцю лічбаў. З такімі лічбамі дзед Дзям'ян на сваім вяку справы не меў і хітрыў:

— Не, калі па мне, дык я б табе даў Героя. Цэнтнераў жа дваццаць пяць возьмеш з гектара?

Мацвей пасмейваўся толькі, ён ведаў аб замілаванасці і ўлюбёнасці дзеда Дзям'яна мена навіта ў гэтую лічбу. Вышэй за яе ён не рызыкаваў падняцца, і калі меў справу з грашыма, дваццаць пяць — гэтай лічбаю ён вымяраў пражытае, атрыманае і аддадзенае. Калі яму споўнілася дваццаць пяць гадоў, толькі тады ён і ажаніўся, толькі па дваццаць пяць рублёў ён пазычаў людзям і прымаў ад іх толькі адзінаю паперкаю. І княжборцы яшчэ і сёння з усмешкаю згадваюць, як ён у свой час, калі быў старшынёю калгаса, страшыў калгаснікаў штрафамі за патраву і самавольныя парубкі. З цяжкасцю разбіраючы пісанае ці друкаванае, але вельмі пры гэтым сур'ёзны, ён браў ручку ці аловак, клаў перад сабой чысты аркуш паперы, нешта крэмзаў на ім, бы акт усё роўна складаў. І, склаўшы, абвяшчаў: «У выніку будзе з цябе дваццаць пяць рублёў». Патраўшчык ці парубшчык роблена палохаўся, пачынаў таргавацца, збіваючы дзеда Дзям'яна на іншую лічбу. А таму як для дзеда Дзям'яна іншых лічбаў не існавала, то ўсё заканчвалася выгнаннем вінаватага, вялікай крыўдаю і вялікім сумам старшыні на самога сябе, што ён непісьменны, што ні літары, ні лічбы не падуладныя яму.

— Дваццаць пяць цэнтнераў — гэта не ўраджай, — уядаў цяпер дзеда і ўнук.

— А колькі ўраджай?

— Думаю, што за сорак будзе.

— Два разы, значыць, па дваццаць пяць,— знаходзіўся дзед і пераможна пазіраў на ўнука: не думай, што мы зусім дурныя.

І Мацвей больш не пярэчыў дзеду, то былі самыя шчаслівыя ў іх жыцці імгненні. Стары радаваўся новаму і бласлаўляў неба, што дазволіла яму дажыць і сваімі вачыма паглядзець на гэтае новае. Скажы яму хто-небудзь раней, што яго зямля можа так радзіць, ён бы не паверыў, хаця і прывык верыць сваёй зямлі, як самому сабе. Але верыў не ў казачнае на гэтай зямлі, што магло быць, а ў сапраўднае, устойлівае і пастаяннае, якім быў ён і сам, і таму ўстойліваму і пастаяннаму ён уручаў і самога сябе. І як нешта звычайнае, як нараджэнне чалавека і таксама звычайнага, не волата і не правідца, прызначэнне якога не неба, а зямля, Палессе, Княжбор, так успрымаў ён і тое, што давала зямля,— бульбу, жыта, траву, не патрабуючы ад яе, як не патрабуюць ад жанчыны, большага, чым ёй пад сілу, не гонячыся за гэтым большым нават у думках, каб толькі хапіла хаце, сям'і на круг, устаноўлены прыродаю, ад восені да лета, каб не збіваць зямлю з пастаянства, бо заўсёды ж следам за адным хлебаробам ішоў другі, якому ж таксама трэба было нешта пакінуць. Адзін падаў у разору, другі падхопліваў ручкі плуга, і гэтак бясконца. І зарукай гэтай бясконцасці было не тое, што ён мог ухапіць, адламаць за адзін дзень ці год, быў здольны з'есці за адзін дзень, а размеркаванасць усяго, што можна ўзяць сёння, на ўвесь век-тэрмін і на век-тэрмін усяго сутнаснага, каб у час разліку за ўсё, што ты ўзяў, ніхто не папікнуў, бы ты з'еў чыйсьці век, узяў і з'еў чужы кусок, таму што ён ведаў і верыў у тую сялянскую вышэйшую праўду: няма найвялікшага граху за той, калі ты абкрадзеш мёртвага і ненароджанага альбо таго, хто толькі-толькі нарадзіўся і яшчэ не здольны адстаяць сябе. Мо б ён і не дадумаўся да гэтага, але ўсё гэта ўжо было ў людзях яго зямлі, у крыві, у самой зямлі быў той жа самы запавет, таму і спрадвечным было яго Палессе і аніякая навала— ні агонь, ні вада, ні жалеза — не магла змесці з гэтага маленькага, блакітнага і зялёнага лапіка зямлі, з гэтых расчыненых заўсёды насцеж варот вайны ні дзеда, ні прадзеда, ні самога Дзям'яна, таму што ўсе яны належалі толькі сваёй зямлі і нікому болей, толькі ёй, хаця над імі і над іх зямлёй часам быў і нехта другі, але таму, другому, веку была адпушчана хвіліна. Часцяком яна была і крывавай, але кожны раз адыходзіла ў небыццё, а дзед Дзям'ян заставаўся, бурчаў, крахтаў, наракаў і нёс свой крыж. Даставалася ад дзеда Дзям'яна і ўнуку, Мацвею, хоць за што шкаліў яго дзед Дзям'ян, грыз, еў поедам апошнія тры гады, Мацвей так і не зразумеў, лічыў гэта ўсё за дзівацтва і капрыз: раней было так, а цяпер не, не тое. Вельмі старадаўняя песня старых людзей, якія страцілі ўжо сілу, але яшчэ памятаюць сябе дужымі і моцнымі, дзяцінства і маладосць свае памятаюць. І таму ва ўсім вінаватыя маладыя, што не падобныя на іх, вінаватыя ў тым, што дождж і слота на двары і сонейка свеціць, у тым, што гэтыя маладыя рана і позна жэняцца, раджаюць і не раджаюць дзяцей, усё па-свойму наровяць, зямлю і тую кінуліся пераніцоўваць.

Але ж хлеб, што рос на новым полі, прымірыў унука і дзеда. Стары і малады глядзелі на гэтае поле аднолькава, як аднымі вачыма, і бачылі адно —бачнае і асязальнае, што можна было і памацаць, тое, што раней дзед Дзям'ян мо толькі сніў у самых смелых сваіх снах. І кожны з іх ужо прыкідваў, колькі ж гэта народу можна накарміць іх княжборскім хлебам і чаму зямля хавала гэты хлеб ад іх раней, калі яны былі малымі і калі так хацелася есці, калі за чорны жытны акраец можна было паўжыцця аддаць, аддавалі за яго і жыццё. І балотцу, што ўжо вельмі выразна праявілася ў дубняку, ніхто — ні Мацвей, ні дзед Дзям'ян, ні княжборцы — увагі не аддаваў, як таксама ж не аддавалі ўвагі таму, што сохне дубняк. Яны з маленства прывыклі мець самае большае дзесяць-дванаццаць цэнтнераў з гектара і цяпер былі ўражаны да сэрца, і не толькі небывалым ураджаем, а таксама і ўласнымі сваімі адносінамі да таго, як рыхтаваўся гэты ўраджай, і як жа гэта і за што было наракаць на Мацвея, калі ён цудатворца. Паламаць тое, што складвалася стагоддзямі, парушыць пастаянства самой зямлі — хто яшчэ быў здольны на такое. І шмат каму ўжо мроіліся ўраджаі яшчэ большыя, багацце неверагоднае ўжо мроілася. І гэта былі не сквапнасць і не забыццё саміх сябе, таго, што яны ведалі аб гэтым жыцці, як разумелі гэтае жыццё, іх закалыхала тое, як надта ж, здаецца, лёгка атрымалася ўсё, і гэтая лёгкасць абяцала ў будучым даброты куды большыя. І ўжо Аркадзь Барздыка запасіўся дрэнажнаю трубкаю, цягаў яе паціхеньку і складваў у хлеве, каб распачаць уласную меліярацыю. Мацвей ведаў пра ўсе яго соткі і пра тое, што ён крадзе дрэнаж, але да пары да часу маўчаў, бы ціха помсціў Княжбору за тое, як некалі яго сустрэлі тут. Забылася ці то адышла на нейкі час горыч аб страчанай рэчы, княжборцы цяпер не наракалі, што іх можна было называць ужо не палешукамі, а стэпавікамі. Усіх аб'яднаў і памірыў хлеб, які сапраўды ўсяму галава, і ён дзяржаўна і непадступна калыхаўся і шумеў за вёскаю, пераменлівы, як мора, і бясконцы, як мора. І былі ў ім сіла і праўда. Гэтыя сіла і праўда дапамаглі Мацвею на нейкі час зноў адчуць сябе княжборцам. Пад прыкрыццём гэтага хлеба ён, здавалася яму, не быў больш чужым роднай вёсцы, адным летам яму шмат чаго было даравана, калі не ўсё. Ніхто сёння з княжборцаў, калі бачыў яго на вуліцы, не адварочваўся і не пераходзіў на другі бок. Наадварот, кожны хацеў не толькі проста даць дабрыдзень, але яшчэ і парукацца з ім і пагаварыць аб надвор'і і палітыцы, хаця нейкія два-тры месяцы да гэтага больш чым абыякава пагадзіліся абраць яго старшынёю іх калгаса. У Княжборы да Мацвея было мноства старшынь, амаль што кожны дарослы і сталы княжборац пахадзіў у начальстве, панасіў у сваёй кішэні пячатку, такім чынам, можна лічыць, што радавых калгаснікаў у Княжборы не было, і таму яны так раўнадушна аднесліся да яшчэ аднаго кандыдата ў начальнікі.

І яшчэ недзе напрадвесні Мацвей здаў упраўленне свайму ж таварышу, з якім некалі «лягчаў» трутняў, Сямёну Рачэўскаму, а сам прыняў калгас, які быў створаны, можна лічыць, ім жа. І хаця тое, як адбылося гэтае яго новае назначэнне, было, што дзве кроплі вады, падобным на ранейшае, калі ён стаў меліяратарам, Мацвей уздыхнуў з палёгкаю. Ён прадчуваў, што рана ці позна, а ўсё ж прыйдзецца яму быць старшынёю калгаса, яшчэ з таго дня, калі разам з Шахраем і сакратаром абкома ездзіў па Палессі. Але ён не думаў, што ўсё адбудзецца так лёгка і непрыкметна. У тую вясну ён рыхтаваўся працягваць меліярацыю, паабяцаў сабе, што сёлета будзе рабіць ужо зусім інакш, зусім не так, як у мінулым. Будзе рабіць урэшце і для сябе, а не толькі дзеля плана, каштарысу, самаакупляльнасці і г. д. Ён возьме сябе за глотку, стане на нажы з Шахраем, але дабудуе вадасховішча. Гэтае вадасховішча было як стрэмка ў яго сумленні. Мацвей не ведаў, ці так яно ўжо неабходна тут, але памяць аб тым, як усё адбылося з тым вадасховішчам, была вельмі балючай яму, ён нібы прадаў сам сябе, пайшоў на змову з Шахраем пад уплывам хвіліны, гонячыся за жоравам у небе, адмовіўся будаваць яго, схаваўся за чырвоным алоўкам Шахрая. Цяпер жа ён адчуваў, што ёсць рашучасць і моц вярнуцца назад і выправіцца. Але, як часта гэта здараецца, атрымалася так, што ён спазніўся выпраўляцца: што зроблена, то ўжо зроблена, і ні чорт і ні бог не дапаможа што-небудзь змяніць.

Княжборцы глядзелі на яго, як чакалі нечага ад яго, трывога была ў іх вачах, але і надзея. Яны верылі яму. Ён жа ім, мо, праўда, толькі пакуль што, але і за гэта дзякуй, старшыня, галава, начальнік, не Антонаў сын, Дзям'янаў унук. А Дзям'яны гэтыя — галавастыя. І ён увесь у іх пароду, што-небудзь ды прыдумае. А прыезджыя, што не прыжыліся яшчэ да княжборскай зямлі, глядзелі на яго са спакойнай абыякавасцю, яны ведалі, што, калі і прастойваюць, а тым больш вымушана, грошы ўсё роўна ім плоцяць. І чаго ім хвалявацца: будзе рубель— будзе і хлеб. Паперчына тая рублёвая і была іх хлебам. І колькі яшчэ трэба часу, каб яны зразумелі: паперка і ёсць паперка. Некаторыя ж з іх так і не зразумеюць гэтага. Не цана хлебу паперка, не купляецца ён за грошы, як каханне, давер, аўтарытэт і яшчэ бог ведае што. Усё, пэўна, мае цану, усяму адна цана — толькі пот і кроў, трывога і вера, тое, што ён чытае зараз на тварах сваіх землякоў, у вачах княжборскіх жанчын і бабуль. І ён не ведае, як заплаціць ім за гэтую трывогу і боль, хаця ён і Антонаў сын, дзям'янаўскай пароды, а абнадзейваць проста так язык не варочаецца. Няма чаго даць яму і прыезджым, калі не лічыць той самай паперкі, якую яны ўшаноўваюць, што хлеб. Сам жа хлеб гарыць, і ён не ведае, як патушыць гэты агонь. Хаця добра ведае, перакананы ў іншым: лепей голад, у дзесяць разоў лепш галадоўка, чымсьці такое багацце. На тое, чаго няма,— і суду няма. Страшна, жудасна, калі ёсць, і ўсё гэтае ёсць, здабытае кроўю і потым, —скрозь пальцы. Гэта забівае, забівае ўсё, нават боль, не гаворачы ўжо нічога пра турботы, трывогу і веру. Нязгойны боль, невылечная хвароба ўжо не нясуць у сабе такіх пакут нават блізкім, яны выклікаюць толькі спачуванне, а што ў гэтым толку — вызваленне толькі смерць.

Мацвей адчуваў, што маўчыць ён ужо вельмі доўга, але не стае рашучасці і прамовіць нешта. Вокны ў праўленні адчынены, і з вуліцы наплывае ў іх увесь час нарастаючы гул машыны. Па гуку Мацвей чуе, што ідзе камбайн. І не проста ідзе, а злосна, раве і падвывае матор, злосна рыкае гудок. Вось матор робіць ужо на халастых абаротах, але безупынна гудзе гудок, бы выклікае некага. Мацвей зразумеў усё, зразумеў, што гэта завуць і патрабуюць яго, здагадаўся і хто заве і патрабуе, але не крануўся з месца, чакаў, калі Барздыка сам прыйдзе да яго. І ён прыйшоў, нагою расчыніў дзверы, стаў на парозе, плячыма на ўвесь праём дзвярэй. Дастаў цыгарэту, прыкурыў, але, здаецца, не зацягнуўся, а хутчэй адкусіў ад яе разам з табакай і дыму, заперакідваў цыгарэту з аднаго кутка рота ў другі.

— Пасяджэнне праводзіце?

— Што ў цябе, Васіль?

— Перакур. Прыехаў, як бачыце, таксама на сход, можаце працягваць, Мацвей Антонавіч. Парадак дня толькі мне паведаміце і ўключыце ў спіс выступаючых.

— Паламаўся?

— Я? Паламаўся? Ды ніколі ў жыцці такога не будзе—шырэй вокны адчыняй свае ды стол падцягвай — разгружуся табе на стол. Поўны, Мацвей Антонавіч, бункер, дзве гадзіны машыну чакаю... А вы... прамовы гарачыя...

— Садзіся, паслухай і ты, мы аб адным гаворым.

ЗВОНКІЯ ГАЛАСЫ «КРЫНІЦЫ»



Дзеля фотакарэспандэнта харысты адклалі рэпетыцыю і пайшлі апранаць касцюмы, у якіх звычайна выходзяць на сцэну. А ён павёў іх на бераг Гарыні: на фоне імклівай ракі і раздолля лугоў дзяўчаты ў нацыянальных строях выглядалі так хораша, прывабна. Пакуль рыхтаваліся да здымкаў, самадзейных артыстаў акружылі вяскоўцы, што паблізу чакалі парома. «Паспявайце»... — нясмела папрасіў нехта. І песня, быццам птушка, радасна паляцела па-над берагам. Слухачоў гэтага імправізаванага канцэрта станавілася ўсё больш. «Хораша спяваюць, — уздыхае бабуля са мною побач. — І галасы ёсць, і душа...» Хор «Крыніца» ў Століне ўзнік пяць гадоў назад, але вельмі хутка заваяваў вядомасць за межамі свайго раёна. У 1977 калектыў стаў лаўрэатам І Усесаюзнага фестывалю самадзейнай народнай творчасці, атрымаў званне народнага. Поспех яму прынеслі мясцовыя палескія песні. Шмат іх запісаў ад сваёй маці і спявачак з іншых вёсак кіраўнік хору Мікалай Вайцяхоўскі. «Крыніца» папаўняе рэпертуар няспешна, кожную новую песню спачатку «адшліфуюць» на рэпетыцыях. Спяваюць на 4—5 галасоў, пераважна без музычнага суправаджэння. Так, лічаць самадзейныя артысты, больш выразна можна данесці да слухачоў натуральную прыгажосць народнай мелодыі.

Усімі справамі — ад арганізацыі выступленняў у клубах Століншчыны, паездак у Брэст ці Мінск да рэпертуарнай «палітыкі» — разам з хармайстрам займаецца савет хору — чатыры чалавекі, абраныя ўсімі членамі калектыву. Гэта загатэхнік Галіна Бруцкая, музычны кіраўнік дзіцячага сада Тамара Траянава, работнік будаўніча-мантажнага ўпраўлення Фёдар Стахавец і майстар па рамонту медыцынскай тэхнікі Васіль Дабрыянец. Людзей розных узростаў і прафесій аб'яднала ў «Крыніцы», згуртавала замілаванасць роднай песняй. І збіраюць яны, берагуць неацэнныя скарбы беларускага фальклору, робяць яго духоўным набыткам тысяч слухачоў, неабыякіх да традыцый і культуры свайго народа.

НА ЗДЫМКАХ: «Крыніца» едзе выступаць у вёску; перад канцэртам у старадаўнім Манькавіцкім парку; мастацкі кіраўнік хору — Мікалай ВАЙЦЯХОЎСКІ; пасяджэнне савета хору; Галіна ДАСТАНКА і Ніна КІСЕЛЬ перад выхадам на сцэну.

В. СЕРГІЕЎСКАЯ.

Фота С. КРЫЦКАГА.

Яўгенія Жыгуленка ў вайну была лётчыцай, камандзірам начнога бамбардзіроўшчыка. У 24 гады яна стала Героем Савецкага Саюза.

«У небе — начныя вядзьмаркі» — так называецца мастацкі фільм, што нядаўна выйшаў на экраны. Ён пра Яўгенію Жыгуленка і яе франтавых сяброўак, якія ваявалі ў жаночым 46-м гвардзейскім Таманскім авіяцыйным палку, аб вечных пытаннях — аб сумленні, аб барацьбе дабра і зла, аб каханні.

Рэжысёр фільма і адзін з аўтараў сцэнарыя — Яўгенія Жыгуленка.

«ЦАНУ КОЖНАМУ ВЫЛЕТУ МЫ ВЕДАЛІ — ЖЫЦЦЁ»

ЗМАГАННЕ ПАСЛЯ ПЕРАМОГІ

—...Мы ляталі, ляталі, ляталі, але ваеннаму пеклу не было відаць канца. Праходзіў 44-ты год, мы думалі: вось-вось вайна скончыцца. Пачаўся 45-ты, усе чакалі, яшчэ крыху — і ўсё. А яе ўсё не было, Перамогі, — успамінае Яўгенія Андрэеўна.

Дачакаліся, ён прыйшоў, гэты дзень, больш дакладна, ноч. Прачнулася ад страляніны. Стралялі з усяго, што страляе. Перамога! Пе-ра-мога!

...Чаму мы, дзяўчаты, ішлі на фронт? Таму, напэўна, што не маглі, проста не маглі жыць інакш. Гэта быў не парыў. Парыў — успышка, нешта часовае. Пачуццё абавязку? Так, але не толькі. Можна было працаваць на абарону і ў тыле. Ужо пасля вайны, калі нарадзіўся мой сын, я знайшла прыкладны эквівалент таму стану. Калі з дзіцем нешта здарылася, маці імкнецца быць побач. Ёй здаецца, не будзе яе побач — адбудзецца непапраўнае. Тое ж мы адчувалі ў першыя дні вайны... Мы імкнуліся на фронт таму, што ніхто не хацеў, каб вайна была зацяжной. Кожны наступны дзень яе здаваўся ненатуральным, кашчунным. Мы былі зусім маладымі, мы толькі ўваходзілі ў жыццё, уяўлялі яго святам. Я, напрыклад, збіралася канструяваць дырыжаблі і займацца музыкай. Мне хацелася ездзіць конна, стаць чэмпіёнкай лыжных гонак. І выйсці замуж за каханага — ён быў братам маёй лепшай сяброўкі, служыў у пагранвойсках на Далёкім Усходзе.

І на ўсім гэтым вайна ставіла крыж.

У армію дзяўчат, акрамя медсясцёр, не бралі, дабіваліся мы свайго ўсімі праўдамі і няпраўдамі. Дабіліся — трапілі ў жаночую авіягрупу, якую набірала вядомая лётчыца Марына Раскова.

Эшалон адыходзіў ноччу. Мы глядзелі на маскоўскае неба. І многія не ведалі, што бачаць яго ў апошні раз.

Цану кожнаму вылету мы ведалі — жыццё. І ўсё-такі не верылі ў дрэннае. Вельмі хацелася жыць, убачыць блізкіх. Выкараскваліся з ран, выходзілі з безвыходных сітуацый. Такой крывёю давалася вайна, што думалі, пасля яе светам будуць правіць розум і прыгажосць...

На нашых маленькіх самалётах У-2 мы ляталі ў любое надвор'е, але толькі ноччу. Днём самалёцік-ціхаход станавіўся зусім безабаронным, проста жывой мішэнню для ворага. Але затое ноччу... Мы бамбілі фашысцкія самалёты на аэрадромах, масты, эшалоны. Фашысты празвалі нас начнымі вядзьмаркамі, ненавідзелі нас і баяліся, нездарма за кожны збіты У-2 фашысцкі лётчык атрымліваў жалезны крыж.

З захаду да світання з інтэрвалам дзве мінуты падымаліся з аэрадромаў У-2 з дзвюма лётчыцамі — камандзірам і штурманам. Лёгкіх палётаў не было, і амаль не было спакойных начэй. Асабліва цяжка даводзілася ў Крыме.

Потым мы выручалі чарнаморскіх дэсантнікаў на Малой зямлі — боепрыпасамі, прадуктамі, медыкаментамі. Ляталі амаль упоравень з зямлёй, «навобмацак», наўкола ворагі. Нашы змагаліся гераічна.

І ўсё-такі можна было калі не прывыкнуць, то змірыцца з многім. З зеніткамі і пражэктарамі. І калі бачыш дзіркі ад куль на плоскасцях свайго У-2. І калі размаўляць пасля палёту не можаш, не слухаюцца губы, дрыжаць калені. І нават калі не вяртаецца сяброўка. Верыш: жывая, вернецца.

Але нельга было прывыкнуць (ды і немагчыма гэта, напэўна) да адчування бяссілля, калі не можаш дапамагчы людзям.

Ніколі не забуду. Адбамбіўшы, на досвітку ляцелі над Беларуссю. На брыючым палёце. Колькі вока бачыць — сцелецца дым ад пажарышчаў, замест вёсак — абгарэлыя коміны. А па дарогах брыдуць ледзь-ледзь бабулі з клункамі. Побач — дзіця, галоўка льняная. А рукаў кашулькі пусты. Або мыліцай сам сабе ісці дапамагае. Вяртаюцца ў родныя паселішчы, якіх няма.

Душа разрывалася. А чым паможаш? Рэзала гэта так, хоць крычы.

Трыццаць шэсць гадоў без вайны. Трыццаць шэсць. Вось і гарады адбудаваліся, і варонкі зацягнуліся, і дзеці выраслі, і змянілася жыццё. Але ці можна забыць аб ёй? Не. Таму што амаль у кожным савецкім доме, да каго ні прыйдзеш,— драма, звязаная з вайной. Як каток, прайшлася вайна не толькі па франтавіках, ён яшчэ коціцца па нашых дзецях і дзецях нашых дзяцей. Мы працягваем расплачвацца за яе бясконцымі стратамі. Адзінотай. Здароўем. Без бацькоў выраслі дзеці. Без дзядоў растуць унукі.

У небе Полышчы згарэлі Вера Белік і Таня Макарава. У дзяўчат быў любімы занятак — вымяралі па карце, колькі кіламетраў засталося да Берліна. Таня асабліва чакала канца вайны — збіралася замуж...

Мой муж памёр пасля вайны, памёр ад ран — праклятая ваенная спадчына.

Руфіна Гашава, былы штурман, таксама рана страціла мужа, ён, як мой, памёр ад ран.

Штурман Саша Папова так і не выйшла замуж. Яе любімага забілі на вайне.

Камандзір нашага палка Еўдакія Бяршанская — шчаслівая бабуля васьмярых унукаў — часта і цяжка хварэе. Раны і нервовае ўзрушэнне даюць аб сабе знаць.

Гэта толькі пра маіх сяброўак. А блакадны Ленінград? А Сталінград? А Крым, а Беларусь, а шматпакутная Расія? Што ні хата — партрэты загінуўшых.

Ненавіджу вайну. Таму і здымаю кіно аб ёй. Не павінна ўсё гэта паўтарыцца. Не павінна.

Запісала Наталля КРАМІНАВА.

РЭПАРТАЖ З ЛЯСНОЙ ПАЛЯНЫ

II. НАШ КАЛЮЧЫ СЯБАР

Пачатак восені асабліва цудоўны ў лесе. Паветра насычана водарам яшчэ квітнеючых траў, смалістых соснаў і спелых ягад. Навокал ціха-ціха. І толькі вершаліны высокіх дрэў працягваюць сваю бясконцую размову з ветрам.

На лясной сцяжынцы ў промнях ранішняга сонца, скруціўшыся ў клубок, ляжыць змяя. Даволі прыгожы, своеасаблівы малюнак працягнуўся па ўсёй яе спіне. Гэта гадзюка. Чуецца слабы шорах, і на сцяжынцы з'яўляецца вожык. Усю ноч ён блукаў у пошуках корму і цяпер спяшаецца на адпачынак. Убачыўшы змяю, ён на імгненне замірае, а затым кідаецца на яе. Тая, як толькі заўважыла небяспеку, узняла высока галаву і зрабіла кідок, стараючыся ўкусіць праціўніка. Вожыка гэта не палохае, ён апускае свой носік і выстаўляе калючы панцыр над галавой. Гадзюка зноў і зноў кідаецца на вожыка, але кожны раз у яе пашчы аказваюцца вострыя іголкі. Праз некаторы час гадзюка, параніўшыся і, відаць, страціўшы свае сілы, крыху сціхае. Гэтага бывае дастаткова, каб вожык схапіў яе. Змяя яшчэ працягвае выкручвацца, але вожыка гэта не бянтэжыць, і ён прымаецца за ежу. Раптоўна кідае свой «сняданак» і скручваецца ў клубок. Што здарылася? Хто яму перашкодзіў?

З густога хмызняку вытыркаецца мордачка рыжага лісяняці. Прынюхваючыся, яно набліжаецца да вожыка і спрабуе схапіць яго. Але, укалоўшыся, паспешліва адскоквае, а затым асцярожна і павольна вяртаецца да гэтага дзіўнага шара. Заўважыўшы пашматаную гадзюку, лісяня хапае яе і знікае са сваёй здабычай у хмызняку. Праходзіць некалькі мінут, пакуль вожык, відаць, заспакоіўшыся, разварочваецца і працягвае свой шлях.

А калі б гадзюцы ўдалося ўкусіць вожыка? Гэта зусім не пашкодзіла б звярку: ён неўспрымальны да змяінага яду. Зацікавіўшыся гэтым трывалым імунітэтам вожыкаў, вучоныя правялі на іх выпрабаванне мацнейшых ядаў. Аказалася, што звярок вытрымлівае дозу таксіну слупняку, здольную загубіць некалькі тысяч чалавек. І наогул, на вожыка не дзейнічаюць нават такія мацнейшыя яды, як мыш'як, які забівае любую жывёліну. Пэўна, таму вожыкі і смела палююць на ядавітых змей.

А ці толькі змеямі харчуецца вожык? Калючы храбрэц некапрызны ў выбары ежы. Жукі і іх лічынкі, вусні, конікі, земляныя чарвякі і смаўжы — усё ўваходзіць у «меню» вожыка. Не грэбуе ён і вегетарыянскімі стравамі. Любіць лясныя суніцы і іншыя ягады, паядае арэхі і жалуды. Выкопвае і корміцца сакавітымі цыбулькамі і карэннямі раслін. Але асноўны яго корм — насякомыя. Паядае ён іх на працягу сутак прыкладна столькі ж, колькі сам важыць (да кілаграма).

Вожык любіць густыя зараснікі хмызняку, дзе робіць сабе норку. Тут да яго цяжка дабрацца. Яго індывідуальны ўчастак, дзе ён жыве і корміцца, складае два-тры гектары. Гаспадар выганяе любога «саперніка», які з'яўляецца на яго тэрыторыі. Вожык — начны звярок. Позна ўвечары ён пакідае сваё жыллё і выходзіць на паляванне. Бачыць вожык не вельмі добра, ён блізарукі, затое слых і нюх у яго развіты выдатна. Вожык—някепскі спрынтэр. Калі ён заўважыць лясную мыш, то бяжыць за ёю з хуткасцю да 20 метраў у мінуту.

Што датычыцца працягласці жыцця вожыка, то вучоныя не прыйшлі да адзінай думкі. Некаторыя лічаць, што жыве ён усяго тры — чатыры гады, а балгарскі прафесар Нікола Боеў называе восемь—дзесяць гадоў.

Вясной вожыкі становяцца вельмі задзірыстымі. Варта сустрэцца двум саперникам, як адразу ж пачынаецца бойка. Самцы незадаволена фыркаюць і нападаюць адзін на аднаго. Кожны імкнецца ўкусіць свайго праціўніка. У час гэтых бязлітасных вясенніх паядынкаў яны наносяць адзін аднаму сур'ёзныя раны. Нягледзячы на ваяўнічасць, вожыкі здольныя нават і на «лірыку». Калі вясной самец сустракае самку, то пачынае выдаваць гукі, падобныя на рохканне. Але праходзіць шлюбная пара, і вожык зноў адасабляецца, пакінуўшы ўсе клопаты па выхаванню патомства сваёй сяброўцы. У канцы вясны, пачатку лета самка прыносіць звычайна пяць—сем, радзей дзесяць маленькіх звяркоў. Яны сляпыя, велічынёй з мышанят. На спіне ў іх шэраг бугаркоў, з якіх у першыя ж суткі вырастаюць мяккія белыя рагавыя іголачкі. Пачынаюць бачыць малыя праз два тыдні. Растуць хутка і праз два месяцы дасягаюць памераў сваіх бацькоў. Яны пакідаюць «родны дом», і кожны з іх пачынае весці самастойнае жыццё.

Нягледзячы на тое, што звяркі раслі ў вялікай і «дружнай» сям'і, яны ўжо больш ніколі не падтрымліваюць паміж сабой і бацькамі сваяцкіх адносін. А на наступны год гэтыя маладыя вожыкі ўжо здольныя самі стаць бацькамі.

Вожыкі валодаюць цудоўнай здольнасцю да арыентацыі. Аднойчы ручнога вожыка вывезлі і выпусцілі ў лесе за пяць кіламетраў ад дому, а ён праз тры дні вярнуўся да гаспадароў назад. У літаратуры апісваецца выпадак, калі вожыка выпусцілі ў лесе за 70 кіламетраў ад дому, дзе ён жыў каля двух месяцаў. Якім жа было здзіўленне гаспадароў, калі праз тры месяцы вожык зноў вярнуўся да іх!

З надыходам халадоў вожык пачынае прыводзіць у парадак сваё жыллё — неглыбокую нару, размешчаную ў зараснікаў густога хмызняку, паміж карэннямі або пад ствалом зваленага дрэва: высцілае яго сухім лісцем, імхом і травой. З першымі замаразкамі настае для вожыка галодная і халодная пара. Каб перажыць доўгую зіму, звярок упадае ў працяглую спячку. Тэмпература цела ў яго з 34 градусаў падае да 2. Работа сэрца настолькі замаруджваецца, што становіцца амаль непрыкметнай. Калі зімой зазірнуць у жыллё вожыка, то можна ўбачыць вялікі шар з сухога лісця, унутры якога і ляжыць, скруціўшыся ў клубок, сонны звярок.

Аляксандр КУРСКОЎ.

НА ЗДЫМКУ: вось так маленькі вожык распраўляецца са змяёй.

Фота аўтара.

Сёлета ў Мінску ўпершыню адбылося гарадское свята самадзейнага выяўленчага мастацтва. У скверы імя Янкі Купалы сабраліся мінчане і госці сталіцы, каб паглядзець выступленні вядомых калектываў мастацкай самадзейнасці.

Асаблівую ўвагу прысутных прыцягнуў конкурс дзіцячага малюнка на асфальце, што праводзіўся ў рамках свята. Дзесяткі хлопчыкаў і дзяўчынак запоўнілі набярэжную Свіслачы. Кожны маляваў тое, што найбольш блізкае яму, — персанажаў любімых казак, сяброў, знаёмых, пейзажы.

НА ЗДЫМКАХ: удзельнікі свята; конкурс «юных мастакоў».

Фота У. КРУКА.

у вашу калекцыю

НАВІНЫ САВЕЦКАЙ ФІЛАТЭЛІІ

60-годдзе перамогі народнай рэвалюцыі ў Манголіі Міністэрства сувязі СССР адзначыла выпускам новай паштовай мініяцюры, кампазіцыю якой утвараюць дзяржаўны герб і флаг МНР, а таксама акаймаваны нацыянальным арнаментам памятны надпіс: «60 гадоў Мангольскай народнай рэвалюцыі». Паштовая серыя «Судны савецкага рачнога флоту» складаецца з чатырох марак. Серыю адкрывае адлюстраванне флагмана рачнога пасажырскага флоту — дызеля-электрахода «Ленін». На наступнай мініяцюры — трохпалубны пасажырскі цеплаход «Касманаўт Гагарын», разлічаны на перавозку больш 300 чалавек. Працягвае серыю малюнак цеплахода «Валяр'ян Куйбышаў». Апошняя марка прысвечана сухагрузнаму цеплаходу змешанага плавання тыпу «рака-мора» — «Балтыйскі».

У серыі «Ледакольны флот СССР» выдадзена марка, прысвечаная славутаму ледакольнаму параходу «Малыгін», названая ў гонар С. Малыгіна — капітана-камандора рускага флоту, вядомага даследчыка Арктыкі. Судна было пабудавана ў 1912 годзе і да 1940 года праводзіла розныя даследаванні ў раёнах Савецкай Арктыкі.

Выпушчаны маркіраваны канверт да 125-годдзя з дня нараджэння вядомага рускага жывапісца і графіка А. Васняцова. На канверце яго партрэт і памятны надпіс.

У 1970 годзе на борце савецкага самалёта была забіта бандытамі бортправадніца Надзея Курчанка. Міністэрства сувязі СССР выпусціла авіяканверт з партрэтам дзяўчыны. Пад партрэтам юнай гераіні надпіс «Бортправадніца камсамолка Надзея Курчанка. 1950—1970».

Л. КОЛАСАЎ.

ВОСЬ ДЫК АГУРОК

Інжынеру Мастоўскага раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі Сяргею Пышніку ўдалося вырасціць на падконніку агурок, які заважыў 1 400 грамаў, меў у даўжыню амаль не метр. У кватэры аматара прыроды цэлае лета даюць багаты ўраджай памідоры сорту «альфа», зімой радуюць вока суніцы, лімоны.

СПОРТ

ВЫСОКІЯ БАЛЫ ПАРТНОВА

Каму-каму, а мінчаніну Аляксандру Партнову было асабліва цяжка на першынстве Еўропы, якое праходзіла ў югаслаўскім горадзе Спліце. Чэмпіёну Алімпіяды-80 па скачках у ваду з трампліна не пашанцавала: ён перанёс аперацыю меніска і доўгі час не трэніраваўся.

Але спартсмен праявіў цвёрдую волю да перамогі. У фінале ён выканаў самыя складаныя скачкі і набраў гросмайстарскую суму балаў: 665,94. Гэта прынесла Партнову першае месца.

Ён апярэдзіў сваіх галоўных канкурэнтаў — таварыша па камандзе Кузьміна, аўстрыйца Стайковіча, Хофмана (ГДР) — больш як на дваццаць балаў.

Яшчэ адзін медаль па скачках у ваду, сярэбраны, заваяваў у Югаславіі на першынстве кантынента мінчанін Уладзімір Алейнік.

УПЕРШЫНЮ

У Мюнхене завяршыўся чэмпіянат свету па акадэмічным веславанні. Савецкая каманда заваявала тры вышэйшыя ўзнагароды.

Асабліва прыемным быў поспех нашай васьмёркі, дзе заграбным мінчанін Ігар Майстрэнка. Упершыню на чэмпіянаце свету савецкая мужчынская васьмёрка заваявала першае месца.

АСІЛАК З ВІЦЕБСКА

Імя шведскага барца класічнага стылю Андэрсана добра вядома. Ён не раз перамагаў на чэмпіянатах свету. Яму ж спецыялісты прадказвалі першае месца і на чарговым турніры ў Осла.

Але гэтыя прагнозы не спраўдзіліся. Сярэбраны прызёр Маскоўскай Алімпіяды Ігар Каныгін з Віцебска змог выйграць у грознага саперніка і стаў чэмпіёнам свету.

За высокія спартыўныя дасягненні яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны майстар спорту СССР».

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:
МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1457